Ф 27-022

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы»
_______________ Кітурка І.Ф.
30 ______ 2021 г.

**КОМПЛЕКСНАЯ ПРАГРАМА РАЗВІЦЦЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

1-21 05 01 Беларуская філалогія
I ступені вышэйшай адукацыі
на філалагічным факультэце
ва ўстанове адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі»

Гродна 2021

## 1. Стратэгічнае бачанне развіцця адукацыйнай праграмы

Кафедра беларускай філалогіі працягвае традыцыі кафедры беларускай мовы – адной са старэйшых не толькі на філалагічным факультэце, але і ва ўніверсітэце ў цэлым. У 2013 годзе да яе была далучана кафедра беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства. У 2017 годзе пасля аб'яднання з кафедрай беларускай літаратуры атрымала сучасную назву – кафедра беларускай філалогіі (загад № 1479 ад 27.12.2016 г.)

Кафедра з'яўляецца выпускаючай па спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія» (па напрамках).

Вучэбная праца кафедры ажыццяўляецца згодна з навучальнымі планамі спецыяльнасці і плана работы кафедры.

Кафедра забяспечвае выкладанне лінгвістычных і літаратуразнаўчых дысцыплін для студэнтаў спецыяльнасці «Беларуская філалогія». Таксама кафедра забяспечвае выкладанне дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» і шэрагу іншых амаль на ўсіх факультэтах універсітэта.

Кафедра ажыццяўляе падрыхтоўку студэнтаў па спецыялізацыях «Мовазнаўства» і «Літаратуразнаўства», а таксама па напрамках «Літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць» і «Дзелавая камунікацыя».

Кафедра ажыццяўляе падрыхтоўку магістрантаў па спецыяльнасці 1-21 80 11 – Мовазнаўства.

Адным з найважнейшых напрамкаў развіцця патэнцыялу кафедры з'яўляецца навучанне супрацоўнікаў ў аспірантуры і дактарантуры. Пры кафедры працуе аспірантура па спецыяльнасцях 10.02.01 – Беларуская мова, 10.02.20 – Параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства (навуковае кіраўніцтва аспірантамі ажыццяўляе дацэнт Варановіч В.Л.).

За кафедрай замацавана 79 курсаў і спецкурсаў. Па ўсіх дысцыплінах кафедры распрацаваны вучэбныя праграмы, складзеныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі новага адукацыйнага стандарту. Усе навучальныя праграмы прайшлі знешняе і ўнутранае рэцэнзаванне. Пакет вучэбна-метадычнага забеспячэння ўключае ў сябе вучэбную праграму, пытанні да залікаў і экзаменаў, крытэрыі ацэнкі ведаў і кампетэнцыі. На кафедры распрацавана тэматыка курсавых работ па спецыяльнасці, а таксама тэматыка дыпломных работ. У працэсе выкладання дысцыплін выкладчыкі кафедры карыстаюцца інфармацыйнымі тэхналогіямі. У прыватнасці, на адукацыйным партале размешчаны вучэбна-метадычныя комплексы, хрэстаматыі, дапаможнікі, якія актыўна выкарыстоўваюцца студэнтамі. Значная ўвага на кафедры надаецца КСРС, што адпавядае сучасным тэндэнцыям развіцця вышэйшай адукацыі ў

краіне. КСРС забяспечвае непасрэдную сувязь вучэбнай і навукова-даследчай працы студэнтаў. Самастойная праца са студэнтамі праводзіцца ў адпаведнасці з планаваннем. Яна заключаецца ў падрыхтоўцы рэфератаў, паведамленняў да практычных і лабараторных заняткаў, у напісанні творчых работ і інш. На кафедры вядзецца актыўная праца з адоранымі студэнтамі. Яны рэгулярна ўдзельнічаюць у студэнцкіх навуковых канферэнцыях. Вядзецца праца і з адоранымі першакурснікамі. Кожны год двойчы (пасля сесіі) на пасяджэннях кафедры абмяркоўваецца пытанне аб выніках здачы экзаменаў і залікаў. Таксама на пасяджэннях кафедры абмяркоўваюцца вынікі міжсесійнай атэстацыі студэнтаў. Увогуле, як паказвае аналіз, па дысцыплінах кафедры амаль увесь час студэнты атрымліваюць станоўчыя ацэнкі.

Кафедрай распрацавана праграма ўкаранення інфармацыйных тэхналогій у навучальны працэс, правядзенне КСРС з выкарыстаннем дыстанцыйнага кантролю (e-mail-кантролю, форуму), арганізацыя КСРС на адукацыйным партале www.grsu.edu.by, забеспячэнне тэставымі заданнямі рознага ўзроўню складанасці. На працягу апошніх пяці гадоў адбыліся некаторыя змены ў навучальных планах. У нагрузку кафедры былі ўключаны новыя курсы і спецкурсы: «Асновы тэорыя прамоўніцкай дзейнасці», «Беларуская мова (культура маўлення)» (для неспецыяльных факультэтаў), «Марфаналогія сучаснай беларускай мовы як сістэма», «Медыярыторыка», «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратуры», «Рэдагаванне тэкста ў аспекце неарыторыкі», «Рэдакцыйная падрыхтоўка перакладных выданняў», «Структура рытарычнай дзейнасці», «Стылістыка і культура беларускага маўлення», «Стылістычнае рэдагаванне і карэктура», «Універсітэтазнаўства», «Філасофія мовы», «Эстэтыка слова ў мастацкай літаратуры і публіцыстыцы».

На кафедры працягваецца індывідуальная работа з адоранымі студэнтамі 2-4 курсаў (навуковымі кіраўнікамі з’яўляюцца В.Л. Варановіч, Тарасава С.М., Садоўская А.С., Якалцэвіч М.А.).

У пазавучэбны час на кафедры арганізавана НДРС у межах функцыянавання студэнцкага навуковага гуртка “Роднае слова”. Навуковы кіраўнік гуртка – к. ф. н., дацэнт Аляшкевіч Т.А. у працы СНГ задзейнічаны студэнты 2-х – 4-х курсаў філалагічнага факультэта. Пасяджэнні СНГ праходзяць 1 раз у месяц.

З мэтай прыцягнення студэнтаў у асяроддзе іх будучай прафесійна-педагагічнай дзейнасці пры кафедры працуе філіял на базе ДУА «Сярэдняя школа № 32 Г. Гродна» (Загад ад 08.09.2011 г. № 1184), кіраўнік – к. ф. н., дацэнт кафедры беларускай філалогіі Хлусевіч І. М.

У рамках рэалізацыі канцэпцыі практыка-арыентаванага навучання на кафедры беларускай філалогіі ажыццяўляецца наступная праца:

– на філіяле праводзяцца навучальныя і вытворчыя практыкі студэнтаў 4 курсаў (50% навучэнцаў) спецыяльнасці 1-21 05 01-01 «Беларуская філалогія», практычныя заняткі па методыцы выкладання сучаснай беларускай мовы;

– выкананне дыпломных работ (50%) і магістарскіх дысертацый (100%) па пісьмовай заяўцы прадпрыемстваў і арганізацый;

– вынікі навуковай працы студэнтаў укараняюцца ў навучальны працэс школ, што таксама аптымізуе працэс прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў педагагічных спецыяльнасцяў;

– на базе філіяла штогод праводзяцца конкурсы, круглыя сталы, пасяджэнні СНГ, вучэбна-метадычныя семінары, майстар-класы.

Стала традыцыйным на кафедры праводзіць навуковую канферэнцыю «Купалаўскія чытанні» і па яе выніках выдаваць зборнікі навуковых прац, а таксама агульнаўніверсітэцкую Купалаўскую дыктоўку, якая стала ўжо міжнароднай.

Міжнароднае супрацоўніцтва на кафедры беларускай філалогіі ажыццяўляецца па розных напрамках навуковай, вучэбнай і культурнай дзейнасці. Заключана Дамова аб супрацоўніцтве з кафедрай беларусістыкі факультэта прыкладной лінгвістыкі Варшаўскага ўніверсітэта і Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы (Рэспубліка Беларусь) (дамова № 318 ад 27 мая 2019 года).

**2. Задачы, на вырашэнне якіх накіраваны план развіцця спецыяльнасці**

У рамках рэалізацыі комплекснай праграмы развіцця спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларуская філалогія” на 2021-2025 год плануецца вырашыць шэраг задач, накіраваных на якаснае паляпшэнне асноўных працэсаў адукацыі ў рамках спецыяльнасці, у тым ліку:

– стварыць адукацыйнае асяроддзе, якое забяспечвае падрыхтоўку выпускніка, які валодае кампетэнцыямі ў прафесійнай, даследчай, інавацыйнай і прадпрымальніцкай дзейнасці, запатрабаванай і канкурэнтаздольнай на рынку працы, адаптаванай да паспяховай рэалізацыі свайго прафесійнага і творчага патэнцыялу;

– стварыць умовы для распрацоўкі і ўкаранення ў навучальны працэс вучэбна-метадычнага (таксама і лічбавага) забеспячэння за кошт укаранення сучасных ІКТ і інавацыйных адукацыйных тэхналогій.

– забяспечыць развіццё дыстанцыйнага навучання з прыцягненнем

рэсурсаў арганізацый-партнёраў і замежных навучэнцаў;

– развіваць міжнароднае супрацоўніцтва на аснове ўзаемадзеяння з вядучымі ўніверсітэтамі Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Казахстан, Рэспублікі Узбекістан і іншымі замежнымі вышэйшымі навучальнымі установамі;

– стварыць асобасна-арыентаванае адукацыйнае асяроддзе, якая спрыяе выяўленню і раскрыццю патэнцыялу навучэнцаў шляхам прыцягнення іх да ўдзелу ў мерапрыемствах навуковага і выхаваўчага характару;

– аптымізаваць удзел супрацоўнікаў і студэнтаў юрыдычнага факультэта ў дзейнасці па інтэрнацыяналізацыі ва ўмовах пандэміі з прыцягненнем лічбавых сэрвісаў, Інтэрнэт рэсурсаў.

## 3. Пералік мерапрыемстваў па развіццю спецыяльнасці

### 3.1. Вучэбны працэс

#### 3.1.1. Аналіз працы выпускаючай кафедры па арганізацыі набору абітурыентаў

Кафедра беларускай філалогіі праводзіць актыўную прафарыентацыйную працу сярод абітурыентаў не толькі г. Гродна і Гродзенскай вобласці, але і захплівае ўсе вобласці Рэспублікі Беларусь. Так, кафедра удзельнічае ў выязных прафарыентацыйных мерапрыемствах у рамках Дзён універсітэта (Садоўская, А.С., Тарасава С.М. і інш.).

Філалагічны факультэт перыядычна арганізуе і праводзіць Дні адчыненых дзвярэй. У рамках Дня адчыненых дзвярэй філалагічнага факультэта з абітурыентамі і іх бацькамі сустракаюцца прадстаўнікі адміністрацыі факультэта, ПВС, праводзяцца майстар-класы, адкрытыя практычныя/семінарскія заняткі (Сабуць А.Э. дацэнт кафедры беларускай філалогіі і інш.).

На кафедры беларускай філалогіі працуе Школа беларускага філолага. Кіраўнік – к.пед. н., дацэнт Шандроха Н.Э. Школа праводзіць заняткі па падрыхтоўцы да паступлення ў анлайн-фармаце. Са школьнікамі вобласці праводзіцца таксама Алімпіяда “Філалагічны каледаскоп“. Фармат правядзення Алімпіяды дазваляе прымаць удзел у ёй абітурыентам з усёй вобласці.

Праект творчых работ «Толькі Слова ў вяках жыве...» стартуе кожны год у кастрычніку і традыцыйна прыцягвае вялікую колькасць удзельнікаў, якія ўдзельнічаюць у розных намінацыях: "Буктрэйлер", "Літаратурны Гродна" (экскурсія-прэзентацыя), "Рэцэнзія".

Таксама кожны год выкладчыкі кафедры ўдзельнічаюць у распрацоўцы і абнаўленні рэкламна-інфармацыйных матэрыялаў па прафарыентацыйнай дзейнасці, вядуць сацыяльныя сеткі (Вконтакте, Instagram).

Табліца. Пералік мерапрыемстваў у галіне прафарыентацыйнай і маркетынгавай дзейнасці

| № | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказны | Рэсурсы, крыніцы фінансавання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Конкурс творчых прац школьнікаў «Толькі Слова ў вяках жыве...» | Красавік, штогод | Тарасава С.М., ст. выкладчык кафедры беларускай філалогіі | Сродкі філалагічнага факультэта |
| 2. | Правядзенне алімпіяды па беларускай мове і літаратуры "Філалагічны калейдаскоп" са школьнікамі вобласці | Сакавік, штогод | Садоўская А.С., загадчык кафедры беларускай філалогіі | Сродкі філалагічнага факультэта |
| 3. | Праца “Школы белорусскага філолага ” | Са снежня 2020 па чэрвень 2штогод | Шандроха Н.Э., дацэнт кафедры беларускай філалогіі | Не патрабуюцца |
| 4. | Прафарыентацыйныя мерапрыемствы з выездам у Воранаўскі раён | Чэрвень, штогод | Дацэнты кафедры беларускай філалогіі Казлоўскі Р.К., Сабуць А.Э. | Сродкі філалагічнага факультэта |
| 5. | Прафарыентацыйныя мерапрыемствы з выездам у г. Слонім і Слонімскі раён | штогод | Дацэнты кафедры | Сродкі філалагічнага факультэта |
| 6. | Прафарыентацыйныя мерапрыемствы ў каледжах ГрДУ | штогод | Садоўская А.С., загадчык кафедры беларускай філалогіі | Сродкі філалагічнага факультэта |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7. | Арганізацыя працы падрыхтоўчых курсаў для абітурыентаў спецыяльнасці “Беларуская філалогія” ў перыяд падрыхтоўкі дакументаў для паступлення ва ўніверсітэт | Лінень штогод | Садоўская А.С., Тарасава С.М | |
| 8. | Імянная рассылка лістоў пераможцам абласной алімпіяды па беларускай мове і літаратуры з запрашэннем паступаць на філалагічны факультэт ГрДУ імя Янкі Купалы | Май штогод | Садоўская А.С., Тарасава С.М. | Сродкі філалагічнага факультэта |
| 9. | Падрыхтоўка да алімпіяды вучняў Кастрычніцкага раёна г.Гродна | Снежань штогод | Садоўская А.С. Сіпліценя Ж.С., Тарасава С.М., Вараповіч В.Л., Аляшкевіч Т.А. | Сродкі аддзела адукацыі |
| 10. | Правядзенне мерапрыемстваў для абітурыентаў, падрыхтоўка прафарыентацыйных выстаў, стэндаў у школах (СШ № 8, № 34, № 12 г.Гродна, гімназіях № 10,№ 9 ) , філіяле кафедры СШ № 32 г.Гродна | Студзень-Май штогод | Садоўская А.С., Тарасава С.М. | Не патрабуюцца |
| 11. | Удзел у бацькоўскіх сходах з мэтай прафесійнага самавызначэння вучняў, інфармаванне бацькоў аб спецыяльнасцях факультэта (СШ № 6 № 32, № 34, № 12 .Гродна, гімназія № 10) | На працягу года | Усе выкладчыкі кафедры | Не патрабуюцца |
| 12. | Удзел у інфармацыйна-тлумачальных сходах, | На працягу года | Садоўская А.С., Тарасава С.М. | Не |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | арганізаваных Рэгіянальным цэнтрам тэсціравання і прафарыентацыі моладзі | | | патрабуюцца |
| 13. | Прадстаўленне дадатковых адукацыйных паслуг шляхам арганізацыі і правядзення кансультацый “Юныя навукоўцы”, “Да алімнійскіх вяршыняў”, вучэбна-метадычнага семінара для настаўнікаў школ “Малады настаўнік: праблемы, пошукі, знаходкі” (сярэднія школы г.Гродна і Гродзенскай вобласці) | На працягу года | Шандроха Н.Э, Садоўская А.С. Варановіч В.Л., Тарасава С.М. | За кошт заказчыкаў |
| 14. | Правядзенне прафарыентацыйных сустрэч з навучэнцамі СШ № 32 г. Гродна | Сакавік, лістапад штогод | Хлусевіч І.М. Садоўская А.С. | Не патрабуюцца |

**3.1.2. Аналіз існуючых вучэбна-метадычных матэрыялаў для забеспячэння навучальнага працэсу.**

Вучэбна-метадычныя матэрыялы прадстаўлены ў выглядзе абавязковага кампанента ЭВМК па выкладаемых дысцыплінах. Распрацаваны камп’ютарныя тэсты, фонд ацэначных сродкаў, практычныя задачы, квэсты. Бібліятэчныя рэсурсы з’яўляюцца дастатковымі для падрыхтоўкі студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія. Студэнты маюць магчымасць карыстацца папяровым і электронным фондам універсітэта. У электроннай бібліятэцы ёсчць база прац вучоных ГрДУ, асобна ЭВМК і інш.

На дадзены момант на кафедры ствараюцца новыя ЭВМК для студэнтаў розных спецыяльнасцей па дысцыпліне “Беларуская мова: прафесійная лексіка” ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам; існуючыя матэрыялы ўвесь час абнаўляюцца; распрацоўваюцца і ўкараняюцца сродкі дыстанцыйнага кантролю вучэбных дасягненняў студэнтаў; збіраюцца

матэрыялы для інфармацыйнага напаўнення асабістых кабінетаў выкладчыкаў. Пастаянна вядзецца работа па напаўненню ЭВМК матэрыяламі, неабходнымі для арганізацыі КСРС студэнтаў на факультэце, падборы і стварэнні электронных сродкаў навучання (прэзентацыі, навучальныя відэафільмы) па асобных тэмах дысцыплін, замацаваных за кафедрамі. Укараненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у адукацыйны працэс адлюстроўваецца на змене арганізацыйных форм, метадаў і тэхналогій арганізацыі вучэбнай дзейнасці. Выкладчыкамі праводзяцца заняткі з выкарыстаннем мультымедыйных прэзентацый, арганізуецца кансультацыйная работа на аснове выкарыстання сродкаў адукацыйнага партала і электроннай пошты.

Выкладчыкамі кафедр актыўна выкарыстоўваюцца мультымедыйныя прэзентацыі лекцый, аўдыё- і відэаматэрыялы для правядзення заняткаў. Праводзяцца вебінары і кансультацыі ў анлайн-рэжыме. Пастаянна папаўняецца і відазмяняецца матэрыял на адукацыйным партале ГрДУ.

*Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў. Арганізацыя індывідуальнай працы з адоранымі студэнтамі.*

Адукацыйны партал арганізуе змест вучэбнага працэсу. У ім прадстаўлены праграмы па вучэбных дысцыплінах, прэзентацыі лекцыйных заняткаў, заданні да кіруемай самастойнай працы студэнта, пытанні да залікаў і экзаменаў, тэставыя заданні, вучэбныя матэрыялы і заданні да падрыхтоўкі да семінарскіх і практычных заданняў, літаратура па вучэбным каурсе. Прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры імкнецца да поўнага забеспячэння вучэбнага працэсу студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія электроннымі вучэбна-метадычнымі комплексамі да 2025 года.

Сістэмны прынцып арганізацыі адукацыйнага працэсу знайшоў адлюстраванне ў стварэнні ЭВМК, што дазваляе кожнаму студэнту выбраць сваю траекторыю навучання, паўтарыць вывучанае, абагульніць засвоенае, а выкладчыку – прапанаваць мноства варыянтаў навучання, ранжыраваных па ступені нарастання складанасці прадстаўленага матэрыялу, якія адлюстроўваюць як лінейны падыход да навучання, так і нелінейны. За адоранымі студэнтамі замацоўваюцца загадчык кафедры, вядучыя выкладчыкі кафедр для рэалізацыі індывідуальнага падыходу ў адукацыйным працэсе з дадзенымі студэнтамі.

*Арганізацыя кантролю бягучай паспяховасці студэнтаў.*

Для прамежкавага і выніковага кантролю ацэнкі ведаў студэнтаў распрацаваны электронныя тэсты, тэмы рэфератаў, прэзентацый, кейсаў і іншае неабходнае метадычнае забеспячэнне.

Апрача акадэмічных кансультацый, якія сталі ўжо традыцыйнымі, выкладчыкі асвоілі інтэрнэт-кансультацыі: на адукацыйным партале ГрДУ, у сацсетках, блогах і г.д. Гэта своечасовае рашэнне дазволіла павысіць эфектыўнасць засваення навучальнага і навуковага матэрыялу, індывідуалізаваць узаемадзеянне са студэнтамі ў рамках адукацыйнага працэсу, працягнуць часавыя рамкі правядзення кансультацый.

**Табліца. План распрацоўкі (мадэрнізацыі) электронных вучэбна-метадычных комплексаў**

| № | Назва дысцыпліны | Тэрмін выканання | Адказны |
|---|---|---|---|
| 1. | "Сучасная беларуская мова" для студэнтаў спецыяльнасці 1-210502 "Руская філалогія" | Студзень 2022 | Садоўская А.С. |
| 2. | Беларуская мова (прафесійная лексіка)" для студэнтаў спецыяльнасці 1-40 05 01 Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (па напрамках); 1-28 01 02 Электронны маркетынг; 1-25 01 03 Сусветная эканоміка; 1-25 01 07 Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве; 1-25 01 04 Фінансы і крэдыт, | Студзень 2022 | Садоўская А.С. |
| 3. | "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" для студэнтаў спецыяльнасці 1-40 01 01 | Сакавік 2022 | Лісоўская І.С. |
| 4. | "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" для студэнтаў спецыяльнасці 1-40 01 01 | Сакавік 2022 | Лісоўская І.С. |
| 5. | "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" для спецыяльнасці 1-21 05 06 | Лістапад 2022 | Маршэўская В.В. |
| 6. | "Сучасная беларуская мова" для спецыяльнасці 1-21 06 01 | Лістапад 2022 | Маршэўская В.В. |
| 7. | "Практыкум па беларускай | Снежань 2023 | Якалцэвіч М,А. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | арфаграфіі і пунктуацыі” | | |
| 8. | “Стылістыка і культура беларускага маўлення” | Снежань 2023 | Садоўская А.с. |

**3.1.3. Аналіз інавацыйных формаў і метадаў выкладання, а таксама мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне і кантроль якасці навучальнага працэсу**

У адукацыйным працэсе ПВС кафедры укараняюцца сучасныя тэхналогіі і кампетэнтнасна-арыентаваныя заданні. Выкарыстоўваюцца тэхналогіі: электроннае навучанне і дыстанцыйныя адукацыйныя тэхналогіі (ЭВМК, тэсціраванне, вебінары). Да іншых актыўных метадаў, якімі карыстаюцца выкладчыкі, адносяцца: прэзентацыі, праблемныя лекцыі, рашэнне задач і практыка-арыентаваных заданняў, прысутнасць студэнтаў на рэальных майстар-клас ўроках, якія праводзяцца на базе філіяла кафедры і іншых школ.

Выкладчыкі кафедр працуюць з рознымі сеткамі: Internet, сеткі Intranet, АСК «Дэканат», АСК «Кафедра», адукацыйны партала ГрДУ, сэрвісы «Электронны журнал», «Электронны расклад», «Навуковая бібліятэка», «Электронны журнал куратара», электроннай пошты. Усе выкладчыкі кафедры выкарыстоўваюць у рабоце са студэнтамі магчымасці платформаў Webex і Zoom.

Выкладанне дысцыплін вядзецца праз вебінары (платформы Webex, Zoom, WhatsApp, сацыяльныя сеткі Instagram, Укантакце, Telegram); для правядзення практычных, семінарскіх і лабараторных заняткаў шырэй сталі выкарыстоўвацца магчымасці Адукацыйнага партала (заданне, форум, семінар, Wiki і іншыя).

Табліца. План мерапрыемстваў па забеспячэнні якасці навучальнага працэсу

| № | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказны | Рэсурсы, крыніца фінансавання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Арганізацыя і правядзенне метадычнага практыка-арыентаванага семінара «Навукова-даследчая праца ў школе на сучасным этапе» ( на базе СШ № 32 г.Гродна) | Лістапад 2022 | Садоўская А.С., Шандроха Н.Э., Вdespite Варановіч В.Л. | Не патрабуюцца |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2. | Арганізацыя працы з філіялам кафедры СШ № 32 г. Гродна (у адпаведнасці з планам работы філіяла кафедры) | На працягу года | Хлусевіч І.М. | Не патрабуюцца |
| 3. | Правядзенне заняткаў настаўніцай вышэйшай катэгорыі СШ № 32 г. Гродна Фурса М.Г. | Красавік, Верасень 2023 | Садоўская А.С. | Не патрабуюцца |
| 4. | Павышэнне прафесійнага майстэрства выкладчыкаў у СШ № 32 г.Гродна (філіял кафедры) па спецыяльнасці | Чэрвень 2023 г. | Шандроха Н.Э. | Не патрабуюцца |
| 5. | Прыцягненне вядучых спецыялістаў філіяла кафедры СШ № 32 г.Гродна да ўдзелу ў рабоце ў складзе ДзЭК | Чэрвень штогод | Садоўская А.С. | Не патрабуюцца |
| 6. | Кансультаванне настаўнікаў ДУА “СШ № 32 г.Гродна” і іншых школ г.Гродна і Гродзенскай вобласці па напісанні вучнёўскіх конкурсных навукова-даследчых прац | На працягу года | Хлусевіч І.М., Садоўская А.С., Сабуць А.Э., Сіпліженя Ж.С. | Не патрабуюцца |
| 7. | Правядзенне заняткаў са студэнтамі па выкладаемых дысцыплінах спецыяльнасці 1-210501 “Беларуская філалогія” у ДУА “Сярэдняя школа № 32 г.Гродна” | На працягу года | Выкладчыкі кафедры | Не патрабуюцца |
| 8. | Арганізацыя і правядзенне сумесна з ДУА “Гімназія № 7 | Красавік, 2022 | Аляшкевіч Т.А., Сабуць А.Э. , | Не патрабуюцца |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | г.Гродна” адкрытага фестывалю “Культурны воблік горада” | | Садоўская А.С., Казлоўскі Р.К. | |

**3.2. Кадравы патэнцыял**

Агульная колькасць супрацоўнікаў кафедры беларускай філалогіі складае 14 чалавек, сярод якіх – 1 доктар філалагічных навук: Аўтуховіч Т.Я.; 11 кандыдатаў філалагічных навук: Аляшкевіч Т.А., Варановіч В.Л., Казлоўскі Р.К., Брусевіч А.А., Маршэўская В.В., Сабуць А. Э., Садоўская А.С., Сіпліваня Ж.С., Хлусевіч І.М., Якалцэвіч М.А., Янушкевіч С.А.; 1 кандыдат педагагічных навук: Шандроха Н. Э.; 1 старшы выкладчык: Тарасава С.М., якая ў 2023 годзе выходзіць на абарону каныдацкай дысертацыі. Дацэнт Маршэўская В.В. стала суіскальнікам ў дактаратуры пры Інстытуце мовазнаўства. Дацэнты Шандроха Н.Э. і Брусевіч А.А. дактаранты.

У рамках праграмы «Запрошаны прафесар» на філалагічны факультэт па ініцыятыве кафедры беларускай філалогіі і прыязджаюць навукоўцы з Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Польша, праводзячы адкрытыя лекцыі для студэнтаў філалагічнага факультэта; дзеляцца сваім вопытам педагагічнага майстэрства.

Такім чынам, кадравыя і арганізацыйныя рэсурсы кафедры беларускай філалогіі для развіцця навуковага патэнцыялу і павышэння эфектыўнасці навуковай дзейнасці ў цяперашні час і ў перспектыве дастатковыя.

Табліца. Пералік мерапрыемстваў па развіцці кадравага патэнцыялу

| № | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказны | Рэсурсы, крыніцы фінансафання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Праца з адоранымі студэнтамі для прыцягнення паступленні іх у магістратуру | 2021-2025 | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 2. | Праца з магістрантамі з мэтай заахвочвання іх для паступлення ў аспірантуру | 2021-2025 | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 3. | Адукацыйная праграма | Студзень – | Сіпліваня Ж.С. | Пазабюджэтныя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | павышэння кваліфікацыі "Універсітэт адукацыйных інавацый: праектны метад выніковай атэстацыі" | Сакавік 2021 | | сродкі |
| 4. | Завяршэнне дысертацыйнага даследавання і выхад на абарону кандыдацкай дысертацыі | 2022-2023 | Тарасава С.М. | Камандзіроўкі за кошт філалагічнага факультэта |
| 5. | Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі «Университет образовательных инноваций: технология разработки цифровых учебно-методических комплексов» | Кастрычнік 2022 | Варановіч Валерый Леанідавіч | Пазабюджэтныя сродкі |
| 6. | Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі «Формирование просоциальной направленности личности будущих специалистов в цифровом образовании» | Лістапад 2022 | Тарасава Святлана Мікалаеўна | Пазабюджэтныя сродкі |
| 7. | Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі | Кастрычнік 2022 | Сабуць Аліна Эдмундаўна | Пазабюджэтныя сродкі |
| 8. | Адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі «Формирование просоциальной направленности личности будущих специалистов в цифровом образовании» | Лістапад 2022 | Якалцэвіч Марыя Антонаўна | Пазабюджэтныя сродкі |

### 3.3. Навукова-даследчая і інавацыйная дзейнасць

**3.3.I. Інфармацыя аб бягучым стане выкананых на выпускаючай кафедры НДП і інавацыйных праектаў.**

У 2021 годзе навуковыя даследаванні на кафедры беларускай філалогіі праводзілася ў рамках Прыярытэтных напрамкаў навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2021-2025 гады, зацверджаных Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2021 г. № 156.

Тэматыка навуковых даследаванняў, якія вядуцца на кафедры беларускай філалогіі, адпавядае профілю падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці «Беларуская філалогія»

Асноўная мэта НДП членаў кафедры – рэалізацыя навуковага патэнцыялу кафедры і яе ўсебаковае развіццё. Навуковыя інтарэсы выкладчыкаў носяць шматвектарны характар. Амаль усе даследаванні аб'ядноўвае агульнакафедральная тэма «*Лексіка, фразеалогія і граматыка беларускай мовы ў сінхранічным, дыяхранічным і супастаўляльна-тыпалагічным аспектах*». Практычна ўся дзейнасць членаў кафедры ў галіне навуковых даследаванняў арыентавана як на падтрымку навучальнага працэсу, так і распрацоўку актуальных пытанняў мовазнаўства і літаратуразнаўства. У навуковым плане кафедра дэманструе высокія вынікі. Пра гэта сведчыць колькасць выпускаемых манаграфій, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, ЭВМК, артыкулаў у часопісах са спісу ВАК, зборнікі навуковых канферэнцый і іншыя выданні кафедры.

У рамках НДП 6.3 «Фразеалогія ў камунікатыўнай прасторы беларускай мовы», № ДР 20212128, тэрмін выканання НДР 2021 – 2025, падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021-2025 гады. За справаздачны перыяд (2021 г.) было выканана наступнае: Прааналізаваны творы, надрукаваныя ў часопісах "Маладосць", "Полымя" за 2015-2020 гг.; сабраны фактычны матэрыял-картатэка (каля 900 прыкладаў-ужыванняў фразеалагізмаў са структурай словазлучэння).

Дацэнт Маршэўская В.В. **у**першыню ў беларускім мовазнаўстве даследуе дзеяслоўныя фразеалагізмы, іх семантычныя асаблівасці. Вынікі даследавання прадуктыўныя пры напісанні дысертацыйных прац магістрантаў і аспірантаў, а таксама ў навучальным працэсе выкладання мовазнаўчых дысцыплін у ГрДУ імя Янкі Купалы.

Стала традыцыйным на кафедры праводзіць навуковую канферэнцыю "Купалаўскія чытанні" і па яе выніках выдаваць зборнікі навуковых прац.

Члены кафедры штогод удзельнічалі ў многіх навуковых рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях.

Ажыццяўляецца ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў у навучальны працэс і навуковую дзейнасць: аформлены 4 акты.

Навукова-даследчай працай ахоплены і студэнты. Гэтая праца ў асноўным заключаецца ў падрыхтоўцы да абароны курсавых і дыпломных прац. Тэматыка іх у пераважнай большасці звязана з кафедральнымі тэмамі: «Асаблівасці мовы мастацкай літаратуры і публіцыстыкі», «Лексіка,

фразеалогія і граматыка беларускай мовы ў сінхранічным, дыяхранічным і супастаўляльна-тыпалагічным аспектах».

Штогод студэнты прымаюць удзел у студэнцкай навуковай канферэнцыі, дзе выступаюць з дакладамі.

Асноўнымі формамі прыцягнення студэнтаў да НДП з'яўляюцца: правядзенне навуковых даследаванняў у рамках курсавых і дыпломных работ; падрыхтоўка дакладаў і ўдзел у навуковых канферэнцыях і семінарах; публікацыі работ у навуковых зборніках і зборніках канферэнцый (самастойна або ў суаўтарстве з навуковым кіраўніком); удзел у рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых прац, у персанальным конкурсе студэнтаў-даследчыкаў ГрДУ.

За 3 гады (2019, 2020, 2021) на Рэспубліканскі конкурс пададзены 20 работ, усе работы ўдастоены дыпломаў пераможцаў.

Студэнты кафедры беларускай філалогіі прымаюць актыўны ўдзел у рэспубліканскіх і навуковых канферэнцыях ВНУ.

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі вядзецца праз магістратуру і аспірантуру.

Кафедра пастаянна прымае ўдзел у апаніраванні дысертацый, падрыхтоўцы водгукаў на дысертацыі і аўтарэфераты

Члены кафедры працавалі па асноўных накірунках мовазнаўства і літаратуразнаўства, што знайшло адлюстраванне ў шматлікіх публікацыях. Варта адзначыць той факт, што практычна ўсе вынікі НДП, якія прадстаўлены ў публікацыях (артыкулах, дапаможніках), выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе, што знайшло адлюстраванне ў створаных ЭВМК. Калектыў кафедры праводзіць навуковыя даследаванні, якія непасрэдна звязаны з фінансуемымі навуковымі тэмамі.

### 3.3.2. Мерапрыемствы накіраваныя на выкананне НДР.

Кафедра прадаўжае працу над падрыхтоўкай кадраў вышэйшай кваліфікацыі для спецыяльнасцей *10.02.01 – беларуская мова; 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, супастаўляльнае і тыпалагічнае мовазнаўства.* Члены кафедры працуюць у навукова-даследчых праектах ДПНД, БРФФД: 2. кіраўнік – Маршэўская В.В.., удзельнікі – Садоўская А.С., Якалцэвіч М.А.. Працягваецца праца над стварэннем ЭВМК. Усе выкладчыкі кафедры працуюць над агульнакафедральнай тэмай, якія выконваецца за кошт 2-й паловы дня: «Лексіка, фразеалогія і граматыка беларускай мовы ў сінхранічным, дыяхранічным і супастаўляльна-тыпалагічным аспектах”.

У план другой паловы дня, года , які ідзе за справаздачным, уключаны новыя ДПНД: “Функцыянальны аспект лексікі, фразеалогіі і граматыкі беларускай мовы” , навуковы кіраўнік – к.ф.н., дацэнт Садоўская А.С.

Студэнты таксама ўдзельнічаюць у распрацоўцы стартап-праектаў. Так быў прапанаваны наступны праект “Беларуская мова – самая мая”, (кіраўнік – к.ф.н., дацэнт Аляшкевіч Т.А., выканаўцы – студэты 2 курса Янкелайць Ангеліна, Багдзевіч Марыя). Мэта праекта: папулярызацыя беларускай мовы сярод жыхароў і гасцей горада Гродна. Праз папулярызацыю беларускай мовы ў бытавой і турыстычнай сферы садзейнічаць больш актыўнаму яе выкарыстанню.

Разам з кафедрай «Дызайн (графічны)» кафедрай беларускай філалогіі выконваецца міждысцыплінарны праект у рамках выканання курсавых і дыпломных праектаў (работ) «Школьны фразеалагічны мінімум беларускай мовы ў аспекце этымалагічна-візуальнай слоўнікавай распрацоўкі» (кіраўнікі – Хлусевіч Ірына Міхайлаўна, дацэнт кафедры беларускай філалогіі, дацэнт Камышнікава Таццяна Алегаўна, старшы выкладчык кафедры дызайну, магістр пед. навук, выканаўцы – Сецько Маргарыта Анатольеўна, 4 курс «Метады і прыёмы навучання фразеалогіі на ўроку беларускай мовы»; Калодзіна Ганна Андрэеўна, 5 курс «Малюнкі да дыдактычнага матэрыялу па беларускай фразеалогіі для школьнікаў».

Табліца. Пералік мерапрыемстваў па развіцці НДІД

| № | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання | Адказны | Рэсурсы, крыніца фінансавання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Удзель у конкурсе ДПНД | 2021-2025 | Загадчык кафедры, выкладчыкі кафедры | Не патрабуюцца |
| 2. | Рэалізацыя праектаў ДПНІ | 2021-2025 | Кіраўнікі праектаў | За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту |
| 3. | Удзел у праграме «Запрошаны прафесар” | 2021-2025 | Загадчык кафедры | За кошт пазабюджэтных сродкаў |
| 4. | Удзел у міжнародных, рэспубліканскіх | 2021-2025 | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | конкурсах маладых навукоўцаў | | | |
| 5. | Удзел у Рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых прац, алімпіядах і міжнародных конкурсах | 2021-2025 | Загадчык кафедры | Не патрабуюцца |
| 6. | Публікацыі навуковых артыкулаў са спіса ВАК | 2021-2025 | Загадчык кафедры, выкладчыкі | Не патрабуюцца |
| 7. | Распрацаваць сумесна з кафедрай "Дызайн (графіка)" міждысцыплінарны праект | 2021-2025 | Кіраўнікі праекта, студэнты | Без затрат |
| 8. | Зааахвоціць студэнтаў да працы ў Студыі праектаў і стартапаў | 2021-2025 | Кіраўнік студэнцкага навуковага гуртка | Не патрабуюцца |
| 9. | Падрыхтоўка і выданне навуковых зборнікаў, манаграфій | 2021-2025 | Выкладчыкі | Сродкі ППС, пазабюджэтныя сродкі |
| 10. | Правядзенне практыка-арыентаваных семінараў для настаўнікаў школ | 2021-2025 | Загадчык кафедры, выкладчыкі | Без затрат |

**3.4. Супрацоўніцтва, у т.л. міжнароднае**

**3.4.І. Інфармацыя аб існуючых на момант напісання праграмах партнёрах**

Міжнароднае супрацоўніцтва на кафедры беларускай філалогіі ажыццяўляецца па розных напрамках навуковай, вучэбнай і культурнай дзейнасці. Філалагічны факультэт наведалі студэнты і выкладчыкі кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта (Польшча). Заключана Дамова аб супрацоўніцтве з кафедрай беларусістыкі факультэта прыкладной лінгвістыкі

Варшаўскага ўніверсітэта і Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы (Рэспубліка Беларусь). (Дамова № 318 ад 27 мая 2019 года).

Супрацоўніцтва з філіялам "Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа" Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (афіцыйнае ліст ад 28.01.2021 № 355-09-06/81 "Аб прэзентацыі навукова-папулярнага дакументальнага фільма "Гаворкі Беларусі".

Члены кафедры (Варановіч В.Л., Янушкевіч С.А.) ўваходзяць у склад Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Дацэнт Варановіч В.Л. штогадовы член журы заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура».

Дацэнт Казлоўскі Р.К. Член журы конкурса «І толькі слова ў вяках жыве».

Дацэнт Сабуць А.Э. удзельнічала ў працы журы абласнога конкурса прац даследчага характару (канферэнцыі) вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Гродзенскай вобласці «Крыштальная Альфа-2021" (па беларускай літаратуры) / ДУА "Гродзенскі абласны інстытут развіцця адукацыі", 04.11.2021.

Дацэнт Сабуць А.Э. Член рэдакцыйнай калегіі рэгіянальнага літаратурнага альманаха "Наднёманскія хвалі" / ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі".

Дацэнт Сабуць А.Э. Член журы III гарадской навукова-практычнай канферэнцыі "Культурный облик Гродно" / у рамках гарадскога адкрытага Фестывалю "Культурный облик Гродно"/ ДУА "Гімназія № 7 г. Гродна".

Дацэнт Сабуць А.Э. Член журы конкурса літаратурнай творчасці "Мой город, воспетый в строках..." / у рамках гарадскога адкрытага Фестывалю "Культурный облик Гродно"/ ДУА "Гімназія № 7 г. Гродна".

Дацэнт Хлусевіч І.М. член журы заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура».

Загадчык кафедры, дацэнт Садоўская А.С. Старшыня журы III этапу Рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры; член журы XIII абласнога конкурсу даследчых работ навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі "Крыштальная альфа – 2021".

Табліца. Партнёры (якія ёсць).

| **№** | **Назва арганізацыі** | **Накірунак супрацоўніцтва** |
|---|---|---|

| | | |
|---|---|---|
| 1. | ДУА “СШ № 32 г. Гродна”, ДУА “СШ № 6 г.Гродна” | Прафарыентацыйная дзейнасць ПВС: правядзенне тэматычных мерапрыемстваў, інтэлектуальных гульняў, квэстаў, алімпіяд у онлайн і афлайн фармаце |
| 2. | МДУ імя М.В Ламаносава, філалагічны факультэт, кафедра славянскай філалогіі. | Адукацыйная, навуковая (публікацыя, рэцэнзаванне навуковых артыкулаў) |
| 3. | Супрацоўніцтва з кафедрай гісторыі беларускай мовы БДУ, кафедрай беларускай мовы Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, кафедрай беларускай мовы Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, кафедрай беларускага мовазнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна | Удзел у канферэнцыях, рэцэнзаванне навучальнай і навуковай літаратуры, стажыроўкі |
| 4. | Супрацоўніцтва з Гродзенскім абласным | Правядзенне тэматычных мерапрыемстваў |

| | | |
|---|---|---|
| | аддзяленнем Саюза пісьменпікаў Беларусі | |
| 5. | Супрацоўніцтва з аддзелам адукацыі спорту і турызму адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г.Гродна | Падрыхтоўка да алімпіяд, удзел у сумесных конкурсах, прафарыентацыйная праца |
| 6. | Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, г. Мінск | Удзел у сумесных мерапрыемтвах (семінары, гутаркі, паэтычныя вечарыны), правядзенне сумеснай канферэнцыі "Купалаўскія чытанні" |

**3.4.2. Інфармацыя аб запланаваных да рэалізацыі мерапрыемствах па развіцці партнёрскіх адносін**

Табліца. Пералік мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва

| № | Назва мерапрыемства (з указаннем арзанізацыі –партнёра) | Тэрмін выканання | Адказныя | Рэсурсы, крыніца фінансафання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Запрашэнне па праграме "Запрошаны прафесар" для чытання лекцый студэнтам спецыяльнасці "Беларуская філалогія" прафесара з МДУ імя М.В. Ламаносава Шэшкен А.Г. | 2022 | Загадчык кафедры | Пазабюджэтныя сродкі |
| 2. | Падрыхтаваць артыкул ў часопіс Stephanos, выдавецтва філалагічнага | 2022 | Тарасава С.М. | Пазабюджэтныя сродкі |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | факультэтаМДУ імя М.В. Ламаносава | | | |
| 3. | Чытанне лекцый для студэнтаў пецыяльнасці “Беларусістыка” Варшаўскага ўніверсітэта (у рамках заключанай дамовы” | 2021 | Садоўская А.С. | Прымаючы бок |
| 4. | Стажыроўкі выкладчыкаў у БДУ | 2021-2025 | Выкладчыкі кафедры | Сродкі факультэта |

**3.5. Інфраструктура і матэрыяльна-тэхнічная база**

Кафедра беларускай філалогіі мае ў сваім распараджэнні чатыры камп'ютары з камплектуючымі, два прынтары, адна шматфункцыянальная прылада (сканер, прынтар, ксеракс). Кафедра праводзіць работу па камплектаванні фондаў навуковай і навучальнай літаратуры для навуковай бібліятэкі ўніверсітэта.

Для правядзення КСРС прызначаны 2 Інтэрнэт-класа - аўд. №7, 8, (вул. Леніна, 32).

На кафедры ажыццяўляецца інфармаванне выкладчыкаў і студэнтаў аб правядзенні навуковых канферэнцый і іншых мерапрыемстваў. Выкладчыкі кафедры удзельнічаюць у навуковых семінарах, якія праводзіцца ва ўніверсітэце і за яго межамі, навуковых семінарах у рамках праграмы «Запрошаны прафесар», у рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях (як offline, так і online), семінарах і форумах, у тым ліку ў рэжыме online.

Усе дысцыпліны забяспечаны неабходнай літаратурай у дастатковай колькасці з бібліятэчнага фонду ўніверсітэта.

Для забеспячэння навучальнага працэсу па ўсіх дысцыплінах спецыяльнасці разгледзець магчымасць абсталявання навучальных аўдыторый тэлевізарам з функцыямі камп’ютара.

## 4. Ацэнка рызык пры рэалізацыі плана развіцця спецыяльнасці

| № | Назва магчымых рызыкаў | Мерапрыемствы па ліквідацыі рызык |
|---|---|---|
| 1. | Узмацненне канкурэнтнай барацьбы на рынку адукацыйных паслуг | Вывучэнне рынку попыту на адукацыйныя паслугі, прафарыентацыйныя мерапрыемствы |
| 2. | Паніжэнне колькасці абітурыентаў, якія паступаюць на спецыяльнасць “Беларуская філалогія” | Узмацненне прафарыентацыйных мерапрыемстваў |
| 3. | Адсутнасць матывацыі ў выпускнікоў універсітэта працягваць навучанне на II ступені вышэйшай адукацыі | Прафарыентацыйныя мерапрыемствы, маркетынгавая дзейнасць |
| 4. | Эпідэміялагічная абстаноўка ў краіне і свеце, звязаная з пандэміяй каронавіруснай інфекцыі | Акцэнт ў адукацыйным і выхаваўчым працэсе кафедры на тэхналагічныя і лічбавыя рэсурсы |
| 5. | Змена попыту і прапаноў на рынку навуковых паслуг | Вывучэнне рынку і попыту адукацыйных паслуг, маркетынгавая дзейнасць |
| 6. | Міграцыя патэнцыйных спажыўцоў (моладзі) для навучання ў іншых краінах | Мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне прэстыжнасці айчыннай вышэйшай адукацы |

Прарэктар па вучэбнай рабоце
____________________ Ю.Э Белых

Дэкан філалагічнага факультэта
____________________ С.В. Ганчар

Загадчык кафедры беларускай філалогіі
____________________ А.С. Садоўская

Рэкамендавана да зацвярджэння

Саветам філалагічнага факультэта
Пратакол № 9 ад 17.11 2021г.

Кафедра беларускай філалогіі
Пратакол № 9 ад 9.11 2021г.